вібрата, глісанда кластэрамі, шматслойнай фактурай. Пры гэтым партытура вельмі багатая на разнастайныя спосабы гукаатрымання як у партыі струнных, так і ў віртуознай партыі габоя.

Твор радуе не толькі тэмбравымі знаходкамі, але і арыгінальнымі фактурнымі, рытмічнымі прыёмамі, якія сведчаць аб тым, што аўтар добра валодае сучаснай кампазітарскай тэхнікай. Безумоўна, захапленне "тэхналогіяй" адбілася ў гэтым творы ў выглядзе некаторых празмернасцей. Але гэты эксперымент з'яўляецца важным крокам на шляху да валодання сучаснымі сродкамі пісьма.

Такім чынам, назіранні за творчасцю маладых беларускіх кампазітараў сведчаць аб тым, што ў цэлым плённа развіваюцца традыцыі папярэдніх дзесяцігоддзяў. Але ўсё ж маладым аўтарам удалося сказаць нямала свайго ў шматгалоссі сучаснай беларускай музыкі.

**Т.І.Чаплыгіна,**
**Н.Я.Петушко,** *выкладчыкі*

## ВЫКАРЫСТАННЕ НАРМАТЫЎНА-МЕТАДЫЧНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ Ў ВЫКЛАДАННІ КУРСА БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАГА МЕНЕДЖМЕНТУ

Курс бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту з'яўляецца адной з вядучых вучэбных бібліятэказнаўчых дысцыплін. Яго вывучэнне абавязковае для ўсіх студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Галоўная мэта курса — даць бібліятэчнаму менеджэру неабходныя веды аб тым, як кіраваць бібліятэкай у новых, дынамічна зменлівых рыначных умовах.

У працэсе вывучэння студэнты знаёмяцца са знешнім і ўнутраным асяроддзем функцыянавання бібліятэкі, з рэгуляваннем яе эканамічных адносін з партнёрамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальнікамі, ініцыятыўнымі формамі гаспадарання, асаблівасцямі кіравання рознымі відамі бібліятэк, пытаннямі і функцыямі кіравання: планаваннем і прагназіраваннем, арганізацыйнай структурай, тэхналогіяй і інш.

Амаль кожная тэма курса разглядаецца на падставе заканадаўчых актаў, палажэнняў, інструкцый, метадычных матэрыялаў па бібліятэчнай справе. У сувязі з гэтым выкладчыкі ў 1998 г. распрацавалі новую праграму курса бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту, якая садзейнічае паглыбленаму вывучэнню, выкарыстанню рэгламентуючых дакументаў у тэарэтычнай і практычнай дзейнасці. Напрыклад, у тэме "Бібліятэчна-інфармацыйны макраменеджмент" студэнты павінны вывучаць юрыдычную базу бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту, арганізацыю сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь, дзяржаўна-грамадскі характар кіравання бібліятэчнай справай. Для гэтага ім прапануецца знаёмства з законамі "Аб культуры ў Беларускай ССР" і "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", з Канцэпцыяй развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама з Палажэннем аб арганізацыі сукупнай сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Гэтае знаёмства пашыраецца і замацоўваецца падчас правядзення лабараторных і семінарскіх заняткаў, круглых сталоў з удзелам бібліятэкараў-практыкаў.

Вядома, што асобныя практычныя заняткі больш эфектыўна праводзіць у бібліятэках, бліжэй да рэальнасці. Тут студэнт лепш адаптуецца да прафесіі. Таму, напрыклад, прынцыпы арганізацыі бібліятэчных тэхналагічных цыклаў, аб якіх студэнты даведаліся на лекцыях, у бібліятэцы набываюць рэальныя абрысы. Так, кожны студэнт атрымлівае заданне правесці аналіз рэальнага ўчастка цыкла "шлях дакумента", выявіць парушэнні аптымальнасці і праматочнасці цыкла, прапанаваць рэкамендацыі па яго ўдасканаленні.

Плённа праведзены заняткі па нарміраванні бібліятэчных працэсаў. Студэнты вывучылі і выкарысталі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеючыя ў бібліятэцы нормы (сёння яны пераглядаюцца), выявілі тыя, якія патрабуюць змянення і ўдасканальвання, правялі хранаметраж асобных дзеянняў і іх нарміраванне.

Тэмы "Арганізацыя бібліятэчных тэхналагічных цыклаў", "Арганізацыя працы ў бібліятэцы", "Нарміраванне бібліятэчных працэсаў", "Арганізацыя рабочага месца", "Структура навуковай бібліятэкі" засвойваюцца лепш, калі выкладчыкі выкарыстоўваюць рэгламентуючую дакументацыю, якая дзейнічае ў бібліятэцы, паказваюць магчымасці нарміравання працэсаў на рабочым месцы, аналізуюць навуковую арганізацыю працы, грунтуючыся на паказчыках аддзела.

Навучанне будучых бібліятэкараў-менеджэраў у бібліятэцы, як бачым, садзейнічае глыбокаму засваенню тэарэтычных ведаў, шырокаму выкарыстанню нарматыўна-метадычнай дакументацыі, робіць практычныя заняткі эфектыўнейшымі за праведзеныя ў лабараторных умовах.

Уключаючыся ў рэальны бібліятэчны працэс, студэнты глыбей пранікаюць у сутнасць будучай прафесіі ва ўмовах пераходу да рынку.

Бібліятэка становіцца часткай вытворчай структуры грамадства, бо мае спецыфічны тавар — інфармацыю, якую можна прадаваць па рыначнай цане. У працэсе лабараторных заняткаў студэнты авалодваюць методыкай распрацоўкі мадэлей платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг. Галоўнае, каб студэнты ведалі, на падставе якіх дакументаў яны могуць мець даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці бібліятэкі (тэма "Фінансавыя рэсурсы").

Рыначныя адносіны прадугледжваюць пераход сістэмы кіравання бібліятэкай ад аператыўнага да стратэгічнага кіравання. Гэта не толькі садзейнічае пастаяннаму абнаўленню і прыстасаванню бібліятэкі да фактараў знешняга і ўнутранага асяроддзя, але і абапіраецца на чалавечы фактар, разглядае персанал як галоўную крыніцу дабрабыту бібліятэкі.

Таму ў раздзеле "Рэсурсы бібліятэчна-інфармацыйных установ" вылучана і шырока вывучаецца тэма "Персанал" на падставе нарматыўна-рэгламентуючай дакументацыі (статут грамадскага аб'яднання "Беларуская бібліятэчная асацыяцыя", загад "Аб тыпавых штатах культурна-асветных установ", "Тыпавыя штаты цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь").

Завяршальным этапам вывучэння курса з'яўляюцца падрыхтоўка і правядзенне дзелавой гульні па тэме "Інспектарскае абследаванне бібліятэкі". Сутнасць яе заключаецца ў тым, каб замацаваць тэарэтычныя веды, выпрацаваць навыкі правядзення праверкі выканання бібліятэкай нарматыўных пастаноў. Студэнты аналізуюць прычыны, якія знаходзяцца ў аснове парушэнняў, і выпрацоўваюць прапановы па іх папярэджанні ў выглядзе "Памятак па інспектаванні ўсіх структурных падраздзяленняў бібліятэкі").

Так выкарыстанне нарматыўна-метадычнай дакументацыі ў выкладанні курса бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту дапамагае ўдасканальваць як арганізацыю заняткаў, так і засваенне студэнтамі вучэбнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ